# ЗМЕСТ

## «Дзе мой край?..»


Дрэва вечнасці. *Апавяданне аб падарожжы ў стагоддзі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

Краявіды Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

Званы ў прадоннях азёр. *Эсэ* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

I. Пачатак ласкавага чэрвеня . . . . . . . . . . . . . . . . 41
II. Плывучы манастыр . . . . . . . . . . . . . . . . 44
III. Мая рака . . . . . . . . . . . . . . . . 49
IV. Брама ў Палессе, або «И разошлись, как в море корабли» . . . . . . . . 52
V. Бакены з рыбай . . . . . . . . . . . . . . . . 54
VI. Міні-Кіеў . . . . . . . . . . . . . . . . 56
VII. Вострыводар лазы . . . . . . . . . . . . . . . . 59
VIII. Паданне пра караля буслоў . . . . . . . . . . . . . . . . 63
IX. Пагарынская Венецыя . . . . . . . . . . . . . . . . 68
X. Вярхоўны цыганскі суддзя . . . . . . . . . . . . . . . . 72
XI. Што такое «бусько» . . . . . . . . . . . . . . . . 78
XII. Мір вам! . . . . . . . . . . . . . . . . 80
XIII. Нараджэнне песні. Нараджэнне жыцця . . . . . . . . 85
XIV. Ціхі вечар . . . . . . . . . . . . . . . . 93
XV. Тапол і на ветры . . . . . . . . . . . . . . . . 99
XVI. Сухі шлях . . . . . . . . . . . . . . . . 102
XVII. Два сярэдневякоўі . . . . . . . . . . . . . . . . 104
XVIII. «Адам буў злеплены з гліны...» . . . . . . . . . . . . . . . . 113

XIX. Кароль уюноў,
або Некалькі марных думак аб Пінску . . . . . . . . . 121
XX. Семдзесят пяць анёлаў з гакам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
XXI. Адзін на палескіх шляхах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
XXII. Адраджэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
XXIII. Напяты світанак. Брэст . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
XXIV. Ізноў гавораць званы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
Белавежская пушча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
Памяць зямлі беларускай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153
Абдуванчык на кромцы вады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157

**«Я прыйшоў на знаёмы плёс
і стаю са звычайнай цаглінай ў руцэ...»**

Балады каменя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177

**«Гэта наш родны горад,
яму не патрэбны прыкрасы...»**

Браслаўе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
«Рша камен...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
З шалёнай вышыні. *Песня аб далечах* . . . . . . . . . . . . . . 199
Тысячу стагоддзяў табе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206
Сцюдзёная вясна, або Тысяча год і сем дзён . . . . . . . . 237
Мсціслаў — дыяментавы горад.
*Эсэ пра гісторыю і людзей адной зямлі* . . . . . . . . . . . . 275

**«Ты прыйшоў і гарачым словам
рунь узняў на роднай зямлі...»**

Вязынка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 407
Пакуль гэта сэрца б’ецца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 417
Песня з паўночных Афін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 424

Наш дзядзька Рыгор . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 430
Вера ў сілу дабрыні, або Сын Беларусі, сын Прагі . . . . 434
Подзвіг Францыска Скарыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 456

**«Тая родная мова, якую й тады не забудзем, калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок...»**

Родная мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 467

**«Дні, як вякі, амаль не маюць меры, і сіла ў рукі просіцца мае...»**

Твой зорны час . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 481

**«Дом друга. Не, дом тысячы сяброў...»**

Казкі Янтарнай краіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 487
...Казка пра срэбнага пеўніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 497
...Відземская казка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 519
...Казка пра янтарны палац . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 529
...Казка пра чалавека, які сыходзіў у пекла . . . . . . . . . . . 556
Вільнюс — частка душы маёй . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 565

**«І горкіх жартаў поўныя кішэні замест манет. Хто хоча — той бяры...»**

Ці дажывём да ста год,
або Пасмяротнае рыданне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 575

**«Ўсё мінае — Гонар не мінае, бо народжаны адным сумленнем...»**

Доўгі адказ на тры кароткія пытанні . . . . . . . . . . . . . . 595

# ДРЭВА ВЕЧНАСЦІ

## *Апавяданне аб падарожжы ў стагоддзі*

Вам ніколі не даводзілася зайздросціць старажытнаму князю Давіду з палескага Гарадка? Мы ў тое лета зайздросцілі яму, як Яга зайздросціў венецыянскаму маўру, як Сальеры зайздросціў Моцарту, як... як усе бяздары зайздросцяць Чалавеку.

Мы — гэта наш шафёр, асістэнт аператара, аператар (ён жа рэжысёр) Анатоль Забалоцкі, друг аператара (нельга ж было кінуць нечаканага госця ў пустым горадзе ды і паехаць) і я, сцэнарыст, ён жа казначэй, ён жа здабывальшчык прыпасаў, адказны за вогнішча, добры хлопец, пры зручным выпадку — брат па бутэльцы і прочая, і прочая, і прочая.

Мы адчувалі сябе бяздарнасцямі. Мы шмат дзён не маглі вытрасці са студыі грошы, машыну, шафёра, скаты, трасцу, халеру. Князю было добра: узяў сабе са скарбніцы тры капы грошай, загадаў стайніку прывесці коней, гукнуў харобрую дружыну ды і пайшоў сабе Палессем, харчуючыся забітымі зубрамі і турамі, шыраючы шызым воўкам, а таксама арлом пад аблацы, проста пад Марыенбург і Берлін — трэсці крыжакоў. Яму гэта ўдавалася лёгка аж у некалькіх дзясятках паходаў, аж пакуль у апошнім не аддаў ён свайму Богу пасечанай мячамі душы.

А ў нас не было ні сваіх коней, ні сваёй скарбніцы, а студыя пачасту трымала сябе так, быццам гэта нам і толькі нам быў патрэбен фільм аб старажытных беларускіх дрэвах.

У другіх паездках было лягчэй, а тут мы намучыліся, як грэшныя душы ў пекле. На схіле дзён я раскажу аб пачатку гэтай паездкі ў Палессе падрабязна, і тады, калі не заплача горкімі слязьмі ўвесь беларускі народ, калі не перапоўніць ён плачам рэк палескіх, — я жывым лягу ў труну і накрыюся вечкам, бо зразумею, што дарэмна стараўся ўсё жыццё, дарэмна зрабіўся масцітым старым, бо такому люду ўжо нішто не дапаможа.

Калі мы ўрэшце здабылі ўсё, што трэба, — выявілася, што «казёл»[1] наш жарэ бензін, як пан Дубатоўк віно (і з такім самым, мала прыкметным, рэзультатам), што скаты нашы маюць тэндэнцыю раз-пораз аддзімаць (пэўна ад спёкі), а тэнт па дзіравасці нагадвае плашч Святога Марціна, а па здатнасці ўсёй паверхняй прапускаць ваду — амаль усе тыя плашчы, якія мне даводзілася купляць за дваццаць год самастойнага жыцця.

Але позна было ўжо, і мы ехалі і ехалі далей у поўнай пакоры лёсу, цьмяна спадзеючыся, што скаты і камеры вытрымаюць лясное карэнне лепей, чым асфальт, што ў ярах, каляінах і дзюнах у «казла»

[1] Народная назва савецкіх пазадарожнікаў Горкаўскага, а затым Ульянаўскага аўтамабільных заводаў. — *Заўв. рэд. (тут і далей, калі адмыслова не пазначана іншае).*

будзе меншы апетыт, што дажджу, дасць Бог, і не будзе, што нам не давядзецца каціць нашага каня і ўсе пажыткі экспедыцыі з нетраў Палесся да цэнтраў цывілізацыі, хаця б і адноснай.

Мы горка памыліліся. Скажу толькі аб дажджы, які паласаваў нас на працягу дванаццаці гадзін, калі мы ехалі назад. Я вёз з сабою рукапіс рамана (хлопцы збіраліся кінуць мяне ў маім Рагачове, вяртаючыся ў Мінск), і ўсе дванаццаць гадзін я сядзеў на рукапісе, прыкрываючы яго ўласным целам.

Пэўна, я прамок з галавы да ног, бо рукапіс па прыездзе быў трохі падмочаны.

Угледзьцеся ў гэтыя падцёкі, нашчадкі, і памяніце нас добрым словам за нашы пакуты.

Не буду расказваць пра ўсю нашу дарогу. Пастараюся толькі пакаяцца перад загадчыкам фермы, што пад Парычамі. Мы выехалі, па віне студыі, позна, прыехалі туды, на бераг Бярозы, зусім уначы, і (паверце, толькі сілаю жорсткіх абставін!) я вымушаны быў сцягнуць з кастра каля фермы некалькі паленцаў, каб раскласці хоць нейкае цяпельца і, хаця пры ягоным святле, нацягаць пасля лаўжоў і сухастою, каб развесці зыркае вогнішча і сяк-так пераначаваць ля яго.

Але вы яшчэ не ведаеце, якая была наша мэта? Мы ехалі ў Палессе, у глыбіню ягоную, за Мазыр і Лельчыцы, каб «засняць» каля вёскі Данілегі славуты тысячагадовы цар-дуб, або дуб Крывашапкі. У нас былі ўжо шасцісотгадовыя дубы, чатырохсотгадовыя

ясені, тапаля Напалеона, дубы Міцкевіча, дубы Ягайлы, проста сямісотгадовыя дубы. Нам пазарэз патрэбен быў тысячагадовы дуб. Без яго фільм быў бы не фільм. Мы проста не маглі дыхаць без тысячагадовага дуба. Мы адчувалі б сябе зганьбаванымі без яго. Лепей было апаганіць грабніцы Тамерлана і Напалеона, чым абысціся без нашага дуба. І вось мы ехалі да яго на нашым «казле».

Ехалі насустрач стагоддзям.

Праскочылі Прыпяць, праскочылі ўтульны ўзгорысты Мазыр. Дзень далёка пераваліў за палову, і я дамогся таго, каб гэтую ноч мы пераначавалі на беразе Прыпяці. Гэтую зямлю нельга глядзець стомленымі вачыма, яна такая адна, і перад ёю, як перад сур'ёзнай кнігай, павінен быць пралог або хаця лірычны ўступ. Лепей за Прыпяць, у гэтым сэнсе, нічога не прыдумаеш. Мы ад'ехалі далёка ад горада, разбілі палатку і паехалі шукаць рыбакоў «у разважанні, чаго б пад'есці».

Самім лавіць было позна. Прыпяць не любіць тых, што бяруцца за справу нахапка.

Каб мы былі разумнейшыя, мы б ведалі, што ніхто не будзе займацца такой дурасцю, як ловы рыбы, калі за ракою касьба, калі звіняць косы, калі гучна смяюцца каля буданоў бабы, гатуючы вячэру, калі хлопцы, абцёршы пукам травы касу, кідаюцца ў раку, каб змыць з сябе дзённы пот, і гучна, цераз мыс, перакідваюцца з дзеўкамі рызыкоўнымі жартамі і ўсім такім іншым, вячэрнім.

# КРАЯВІДЫ БЕЛАРУСІ

Калі на зямлі ёсць казачныя краіны, то адна з іх — Беларусь. І таму не скуднець слядам на яе дарогах. Хто бачыў яе — вернецца. Хто не бачыў — глядзіце. Мы запрашаем вас, добрыя людзі зямлі.

Тут жыць мастакам і паэтам. Тут сіне-зялёны лес з бледнымі азёрамі, у якіх, як кажуць паданні, патанулі гарады (чуеце ўначы звон падводных званоў?). Спакойная моц Дняпра, што бяжыць між суровых урвішчаў, мяккія ўзгоркі Навагрудчыны і вечны шум першабытных лясоў Палесся (яны шумяць пад Лельчыцамі, шуміць, гамоніць тысячагадовы цар-дуб).

Дзяўчына цалуе сланечнік. Шапацяць залатыя бары. І ў духмяным змроку ўтульна сядзяць сімпатычныя брылястыя дзяды-баравікі. І ўсюды праца. Праца сціплага, упартага, моцнага народа, які ведае цану хлебу і любві, цану свабодзе, Радзіме. І ўсюды — клопат да жывога, усюды шырыня чалавечай душы. Наша прырода — гэта наша душа.

Змрочныя, як старадаўнія балады, руіны замкаў, светлыя палацы і храмы, шыпшына на сонных вясковых могілках, свечы бяроз на палянах і зялёныя языкі ядлоўцу ў жыце, верас, на які падалі продкі, баронячы сваю Бацькаўшчыну, — усё гэта таксама душа народа і зямля яго, да апошняй пясчынкі перацёртая працавітымі рукамі.

Чырвоныя захады і пахілае дрэва восені, бэз ля закінутых капліц і сіні палёт сіваваронкі, туман і залаты лубін — гэта мы. Мы з нашай зямлі і з неба, з магутнасці ляснога зубра і пошчакаў салаўя, самых пяшчотных у свеце...

Кракаюць дзікія качкі ў затоках, мякка б'е пыл між пальцаў босых ног на далёкіх дарогах. І салодкі ўвечары дым вогнішча, і гасцінна адчыненыя дзверы ўва ўсіх хатах.

Ідзі, чалавек!

*1968*

# ЗВАНЫ Ў ПРАДОННЯХ АЗЁР

*Эсэ*

Кажуць балады Палесся,
Што ў даўнія злыя гады
Ў правалах танулі замкі,
Цэрквы і гарады.
Азёры ўставалі над шпілямі,
Палі залізваў разліў,
І рыбкі ў байніцы вежаў
Сотняй вясёлак плылі.
Але кажуць дасюль, што ў прадоннях,
Над якімі бяжыць чарот,
Жывы ў гарадах падводных
Стары палескі народ.
Жывыя яго паданні,
І песня, і мовы строй

У недасяжных глыбінях,
Пад сіняй азёрнай вадой.
Яны зберагаюць скарбы
За сябе і за нас усіх,
А мы цягнем свой крыж штодзённы,
І мы забываем іх.
Але дзень настае, калі раптам
На світанні, нібыта праз сон,
З даляў блакітных мы чуем
Ціхі падводны звон.
Гэта значыць, што з вежаў нябачных
Праз світанак над мокрай лазой
Клічуць жывых супакутваць
Званы ў прадоннях азёр:
«Прыйдзіце, каб нам убачыць
На беразе кветку агню.
У нас замест птушак — рыбы,
Багноўкі — замест ячмяню.
Але мы зберагаем Сэрца.
Але нашы й вашы грахі
Выкупляем мы ў прорвах азёраў,
Як калісьці ў пажарах ліхіх.
Прыйдзіце. І словам продкаў
Вады ўскалыхніце свінец,
Каб ведаць, што вы — жывыя,
Што мы недарэмна — на дне.
Што мы недарэмна чакаем,
Калі на паверхню зямлі
Узрынуць, амытыя хвалямі,
Белых званіц караблі.